Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
7 КРАСАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 66 (28430)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Індывідуальны дом – паэтапна**
СТАР. 3



**Як на Лідчыне вясну гукаюць**
СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

# «Шпакоўня» для соні



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Актывісты і валанцёры Брэсцкага аддзялення рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» клапоцяцца не толькі пра птушак, але і пра жывёл. На мінулым ахоўна-адукацыйным летніку ў падтрымку заказніка «Палеская даліна ракі Буг», якія знаходзіцца ў Маларыцкім і Брэсцкім раёнах, аматары прыроды ахвотна майстравалі хаткі для чырванакніжных жывёл — соні-палчка і арэшнікавай соні. На гэтым здымку вядомы арнітолаг Сямён ЛЕВЫ разам з маладымі валанцёркамі развешвае адзін з такіх домікаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Да канца 2017 года ў цэлым па рэспубліцы павінна быць забяспечана сярэдняя зарплата адна тысяча рублёў. У кожнага прадпрыемства ёсць свае арыенціры ў залежнасці ад галіновай прыналежнасці, але ўвогуле такія перспектывы прагладаюцца. Наша задача — рэалізаваць гэта на практыцы. Але рост зарплаты павінен быць прывязаны да прадукцыйнасці працы, раздачы незаробленых грошай не будзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8882 | ▲ |
| Еўра | 2,0118 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0334 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0698 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Тэхналогіі будучыні

## АД КЛАПАНАЎ СЭРЦА ДА ЭЛЕКТРАМАБІЛЯЎ

### Якія распрацоўкі беларускіх навукоўцаў укараняюцца ў прамысловасці?

**Сёлета ў краіне пачалася рэалізацыя праграмы развіцця машынабудаўнічага комплексу, разлічаная на перыяд да 2020 года. Дакумент прадугледжвае стварэнне інавацыйнай прадукцыі новага тэхналагічнага ўзроўню і прагрэсіўных тэхналогій, што немагчыма без дапамогі навукоўцаў. Першыя вынікі ў шырокай аўдыторыі ўжо на слыху: нядаўна быў выпрабаваны беларускі электробус, вядзецца работа над стварэннем айчыннага электрамабіля. Чым яшчэ могуць пахваліцца айчынныя машынабудаўнікі, расказалі прадстаўнікі Міністэрства прамысловасці, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Нацыянальнай акадэміі навук.**

— У гэтую праграму ўваходзіць адразу некалькі знакавых праектаў, — паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення інавацыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці Мінпрама Валерый ФІШМАН.** — Гэта, напрыклад, арганізацыя вытворчасці сартавога пракату на ААТ «БМЗ», асваенне выпуску малалітражных дызельных рухавікоў на Мінскім маторным заводзе і стварэнне высокадакладнага і высокатрывалага чыгуннага ліцця на базе філіяла гэтага ж прадпрыемства ў Стоўбцах, а таксама выраб штучных механічных клапанаў сэрца новага пакалення з палепшанымі характарыстыкамі на заводзе «Электронмаш». На слыху праект па арганізацыі зборкі легкавых аўтамабіляў на ЗАТ «БелДжы» — 1 ліпеня першая чарга завода будзе запушчана.

СТАР. 2

■ Па звароце ў рэдакцыю



## «ДАПАМАЖЫЦЕ ВЯРНУЦЬ ДАЧКУ»

### Бацька хоча адсудзіць дзіця ў былой сужыцелькі

**«Яна татава дачка. Я памятаю яе першы крок, мы разумеем адно аднаго з паўслова», — з цеплынёй расказвае Ілія І.* пра сваю 11-гадовую дачку. Шанц убачыцца з ёй выпадае мужчыну вельмі рэдка. Ілію і маленькую Марыну раздзяляе 250 кіламетраў. І маці дзяўчынкі, якая, па словах бацькі, катэгарычна супраць іх сустрэч. Трэці год бацька судзіцца за тое, каб дачцэ дазволілі жыць разам з ім. Але рашэнні суда пакуль не на карысць мужчыны.**

### Выхаванне — на бацькавых плячах

Гісторыя грузіна Іліі І. падобна да закручанага сюжэта бразільскага серыяла. Толькі дзеянні адбываюцца ў рэальным жыцці і ў беларускіх умовах. (Тут трэба сказаць, што некалькі гадоў таму Ілія І. звяртаўся па дапамогу ў «Звязду». Якая праблема прывяла яго да нас, можаце прачытаць у намары за 24 жніўня 2011 года. Тады сітуацыю ўдалося вырашыць на карысць мужчыны.) Гэта цяпер у Іліі і Людмілы, яго былой сужыцелькі, напружаныя адносіны, а тады, калі яны толькі пазнаёміліся, мужчына закахаўся без памяці. «Яна была мая спраўджаная мара, найлепшая жанчына ў свеце!» — успамінае ён.

Людміла М., амаль на 20 гадоў маладзейшая за яго, дагэтуль ужо была замужам і мела дачку ад першага шлюбу. Праўда, калі той споўнілася 10, перадала дзяўчынку ў сям'ю да сястры ў іншы горад. Побач з другой дачкой, якую нарадзіла ад Іліі таксама доўга не затрымалася. Марыне было тры, калі мама кінула яе. Выхаванне лягло на бацькавы плечы.

Пра тое, што маленькую Марыну даглядаў тата, чытаем і ў актах абследавання, складзеных дзіцячым садком. «У асноўным бацька займаецца выхаваннем і ўтрыманнем непаўналетняй дачкі, паколькі маці з сям'ёй не пражывае і знаходзіцца ў іншым горадзе», — адзначае камісія ў дакументах.

Праз тры гады, у 2013-м, Людміла вярнулася. Забрала дачку да сябе, спрабавала пазбавіць І. бацькоўскіх правоў. Чаму суд стаў на яе бок, для мужчыны незразумела. Так, у Людмілы заробак большы: на пасадзе агародніцы яна атрымлівала 950 рублёў у месяц (Ілія працаваў слесарам за 450 рублёў). Але што да жыллёвых умоў... У сталіцы жанчына жыла ў прыбудове да дома без вокнаў і асобнага санвузла, у Лугавой Слабадзе — у інтэрнаце, у чужым пакоі, які на той момант пуставаў.

— Да школы было 25 кіламетраў, дачка адна ездзіла! — абураецца мужчына. — Аднойчы ў яе па дарозе адабралі кашалёк з грашыма!

А галоўнае, заўважае Ілія, сама Марына казала ў судзе, што хацела б жыць з ім. Псіхолага-педагагічнае даследаванне таксама заключыла: пры выбары пражывання з адным з бацькоў дзяўчынка аддае перавагу тату. Праўда, найлепшы варыянт для яе не гэты. «Хацелася б большага. Хацелася б, каб усе жылі разам, але яны не мірацца», — запісаны адказ Марыны ў дакументах.

СТАР. 4

** Паколькі справа ўсё яшчэ знаходзіцца ў судзе, мы не можам указваць сапраўдныя прозвішчы герояў артыкула.*

# БЯСПЕКА І ЭКАНОМІКА

## Гэтыя складальнікі — аснова для сённяшняга супрацоўніцтва постсавецкіх краін

**Тэрарызм, абарона, беларуска-расійскае супрацоўніцтва, развіццё Саюзнай дзяржавы і рэфармаванне СНД — па ўсіх гэтых тэмах выказаў сваё меркаванне Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас інтэрв'ю тэлеканалу «Мір».**

Гэты тыдзень пачаўся з трагедыі ў метро Санкт-Пецярбурга... Тэрарызм усё часцей напамінае пра сябе і, на жаль, усё бліжэй да нашых меж. Краіны постсавецкай прасторы, нават наша дзяржава, ужо не могуць адчуваць сябе цалкам у бяспецы ў гэтым плане. Натуральна, што першае пытанне Прэзідэнту было прысвечана менавіта нядаўнім падзеям.

— Безумоўна, мы рыхтаваліся, — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка, кажучы пра перагаворы з расійскім калегам, запланаваныя на панядзелак, трэцяга красавіка. — Вы ведаеце, што былі многія супярэчнасці, праблемы ў адносінах Беларусі і Расіі па пэўных пытаннях, і гэта напружвала і мяне, і Прэзідэнта Пуціна... Усё гэта было непрыемна, тым больш паміж нашымі дзяржавамі. І мы рыхтаваліся да гэтай сустрэчы. І вось мы ідзём на гэтую сустрэчу — і якраз паралельна ў гэты ж момант адбываецца тэрарыстычны акт. І ўсе вось гэтыя праблемы, якімі мы жылі, можа быць, некалькі месяцаў да нашай сустрэчы (мы былі поўныя рашучасці, паспрачаўшыся недзе, разрубіць гэты гордзіеў вузел), — усе яны адышлі на задні план. Мы зразумелі ісціннную каштоўнасць у гэтым жыцці. Ну што такое спрэчкі па нафце, па газе і іншае, калі нечакана ў цябе пад носам адбываецца тэрарыстычны акт і гінуць людзі, якіх мы павінны абараніць? Пытанні бяспекі — яны і былі запланаваны як асноўныя, пытанні абароны — яны таксама былі як асноўныя запланаваны да перагавораў з Пуціным, — яны выйшлі на першы план. Усё астатняе, жыцейскае, адышло на задні план, і мы тым не менш прысвяцілі час урэгуляванню гэтых пытанняў. Мы звярнулі ўвагу перш за ўсё на гэта. Вось гэта ўрок быў нам у тую хвіліну, і гэта павінна паслужыць урокам усім.

«Мір» знаёміць сваіх гледачоў з сучасным жыццём і гісторыяй краін постсавецкай прасторы, тэлерадыёкампанія была створана 25 гадоў таму для асвятлення палітычнага, эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Таму не дзіўна, што значная частка пытанняў падчас інтэрв'ю была прысвечана інтэграцыйнаму складальніку.

Прэзідэнт заявіў, што пляцоўку СНД губляць нельга, але ўдзел у арганізацыі павінен быць цікавы ўсім дзяржавам.

— Мы падпісалі дагавор аб зоне свабоднага гандлю, пайшлі на больш сур'ёзнае супрацоўніцтва. Зараз мы павінны падпісаць дагавор аб свабодным перамяшчэнні паслуг, скажам так. Гэта значыць тое, што мы ўжо зрабілі збольшага ў ЕўрАзЭС, а болей у Саюзнай дзяржаве. Вопыт інтэграцый рознага ўзроўню спатрэбіўся. Трэба, каб была зацікаўленасць у гэтых дзяржаў, якія ўваходзяць у СНД, — перакананы Прэзідэнт.

Кіраўнік Беларусі звярнуў увагу, што кожная краіна, калі ўдзельнічае ў якіх-небудзь інтэграцыйных аб'яднаннях, шукае для сябе карысць. Аднак да гэтага дзяржавы павінны падыходзіць асцярожна.

— Выгада не павінна быць за кошт тваіго суседа. Табе выгадна дзесьці, яму таксама дзесьці выгадна, недзе ты саступаеш, дзесьці ён. Але выгада — гэта абавязкова. Калі гэта нявыгадна, як бы гэта меркантыльна ні гучала, каму патрэбны нейкі саюз і нейкія крокі ў гэтым кірунку? — падкрэсліў ён. — Расія сваю выгаду шукае, беларусы і казахі сваю... Але мы знайшлі тыя пытанні, дзе гэта будзе выгадна. Гэта перш за ўсё эканоміка. Эканоміка звязвае так, што потым нікуды не пойдзеш. Гэта ў рамках СНД.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### • У ТЭМУ

**Радзік БАТЫРШЫН, старшыня міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір»:**

— Апошні раз мы сустракаліся з Аляксандрам Рыгоравічам у рамках інтэрв'ю тэлеканалу «Мір» — гэта было пяць гадоў таму. Сёння мы не змаглі абысці галоўную гарачую тэму гэтага тыдня — тэму тэракта ў Санкт-Пецярбургу. Перш за ўсё Прэзідэнт сказаў пра тое, што ў той момант, калі ім павідамілі пра гэтую трагедыю, усе супярэчнасці, якія здаваліся складанымі, адышлі на другі план. Стала ясна, што галоўнае — гэта бяспека нашых дзяржаў, нашых грамадзян. Таму вось гэты эмацыянальны складальнік, што ўсё-такі важнейшага за жыццё людзей нічога не бывае, — бадай, гэта стала лейтматывам нашай размовы з Прэзідэнтам.

# АД КЛАПАНАЎ СЭРЦА ДА ЭЛЕКТРАМАБІЛЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На «Амкадоры» ствараюць сучасны комплекс гідраўлічнай апаратуры, ужо завершана распрацоўка лінейкі гусенічна-колавых экскаватараў (такіх ніколі не выпускаліся ў Беларусі) і машын лесапрамысловага комплексу. На ўжо згаданым маторным заводзе асвойваюць вытворчасць рухавікоў стандартаў Еўра-5 і Еўра-6.

— У межах дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм мы займаемся стварэннем новай тэхнікі сумесна з айчыннымі прадпрыемствамі, забяспечваем праектаванне, віртуальныя і натурныя выпрабаванні, — адзначыў **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Сяргей ПАДДУБКА.** — Сярод апошніх праектаў адзначыў бы завершаную распрацоўку электрамоста новага пакалення для кар'ерных самазвалаў БелАЗ, запушчаны праект электрамабіля на базе аўтамабіляў «БелДжы».

Наперадзе рэалізацыя праекта гібрыднага аўтобуса (які выкарыстоўвае як рухавік унутранага згарання, так і электрарухавік. — **Аўт.**). Таксама мы распрацавалі электрычны модуль, які дазваляе пераўтварыць звычайны грузавік у гібрыдны практычна без унясення змяненняў у канструкцыю. Яшчэ адзін знакавы праект — сумесная з НВЦ па матэрыялазнаўстве распрацоўка беларускага накапляльніка электраэнергіі (так званага суперкандэнсатара) на базе графенападобных матэрыялаў. Гэта вельмі перспектыўны кірунак, бо ўсё ідзе да таго, што электрычны прывад хутка стане асноўным у машынабудаванні.

Адна з апошніх распрацовак, з якімі ўжо хутка змогуць пазнаёміцца жыхары беларускіх гарадоў, — камунальная машына для дваровых тэрыторый, Інстытут машынабудавання перамог у тэндары на яе распрацоўку. Яна ўяўляе з сябе рухомы каркас з розным навясным абсталяваннем: для ўборкі смецця, прыбірання снегу, паліву раслін і іншага. Аналагаў у СНД праект не мае. Плануецца, што да канца года будзе гатовы доследны экзэмпляр, пасля чаго машына паступіць у серыйную вытворчасць. У перспектыве разглядаецца магчымасць пераводу яе на электрычную цягу.




Паводле слоў **начальніка аддзела дзяржаўных і навукова-тэхнічных праграм асноўных сектараў эканомікі ўпраўлення навукова-тэхнічных праграм Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Андрэя СКУРАТОВІЧА,** да 2020 года запланавана распрацоўка кар'ерных самазвалаў грузапад'ёмнасцю 450 тон з прымяненнем электрамеханічнай трансмісіі, асобных дэталяў і вузлоў для грузавых аўтамабіляў, а таксама рэалізацыя іншых праектаў. Спецыяліст падкрэслівае, што ўся гэта прадукцыя мае вялікі экспартны патэнцыял і разлічана, у першую чаргу, на расійскі рынак.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

## ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

**Аблвыканкамы і Мінгарвыканкам 8 красавіка правядуць чарговыя прамыя тэлефонныя лініі. З 9:00 да 12.00 на званкі будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам —** намеснік старшыні ВЯЛІЧКА Алег Іванавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам —** намеснік старшыні МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам —** намеснік старшыні КАНЮШКА Андрэй Васілевіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам —** першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам —** намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам —** намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам —** першы намеснік старшыні РЫМАШЭЎСКІ Фёдар Віктаравіч (80172224444).

■ Блізкая ўлада

# КАБ ПЫТАННІ ВЫРАШАЛІСЯ АПЕРАТЫЎНА

**Новыя падыходы ў рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб абмяркоўваліся на пасяджэнні калегіі Адміністрацыі Прэзідэнта.**



Фота БЕЛТА.

У пасяджэнні прынялі ўдзел службовыя асобы Адміністрацыі Прэзідэнта, КДК, Генпракуратуры, зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, а таксама, што немалаважна, прадстаўнікі мясцовых органаў улады рознага ўзроўню, якія непасрэдна адказваюць за работу са зваротамі грамадзян. Удзельнікі пасяджэння разгледзелі сітуацыю як у цэлым па краіне, так і на прыкладзе асобных міністэрстваў і рэгіёнаў.

Адзначалася, што ў Беларусі выбудавана сістэма работы са зваротамі: ёсць неабходная прававая база, праводзяцца асабістыя прыёмы грамадзян і прамыя тэлефонныя лініі. «Але разам з тым у кожным раёне, горадзе магчымыя і іншыя формы і метады», — упэўнена **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА.** Яна прапанавала мясцовым уладам перыядычна сустракацца з людзьмі па месцы іх жыхарства, запрашаць іх да дыялогу аб хвалюючых праблемах, узяўшы за аснову вопыт дэпутатаў. І гэта толькі адзін з варыянтаў, а наогул, на яе думку, прымальныя любыя формы работы, якія дазволяць аператыўна здымаць пытанні.

Наталля Качанава прывяла прыклад са сваёй практыкі. Будучы старшынёй Наваполацкага гарвыканкама, яна адказвала на тэлефанаванні, якія паступалі непасрэдна ёй ужо пасля заканчэння працоўнага дня. Нумар тэлефона быў у адкрытым доступе, і дзякуючы гэтаму ўдавалася працаваць на апярэджанне.

Працу на апярэджанне ўдзельнікі калегіі абмеркавалі асобна, паведамляе БЕЛТА. Бо сам па сабе зварот — гэта ўжо сведчанне незадаволенасці або неразумення дзеянняў улад. Таму на месцах неабходна больш актыўна і шырока тлумачыць, колькі сродкаў у раённым, гарадскім бюджэце, куды пойдуць гэтыя грошы і чаму. Практыка паказвае, што ў такіх выпадках у людзей узнікае менш пытанняў, чаму рамантуюць дарогу на суседняй, а не на іх вуліцы. Тое ж і з перспектывамі стварэння новых працоўных месцаў, развіццём аховы здароўя, адукацыі, ЖКГ.

Адміністрацыя Прэзідэнта ўдзяляе асаблівую ўвагу ўсім зваротам, нягледзячы на тое, што кожны дзень іх паступае ад 100 да 200, а часам даходзіць і да 400. Кожны з іх тут разглядаюць як магчымасць вызначыць болевыя кропкі кіраўніцкай сістэмы і выправіць сітуацыю. У Адміністрацыю пішуць практычна пра ўсё — нават пра цвіль на сценах, дрэнную якасць вады і разбітыя дарогі. Тут правялі аналіз зваротаў і прыйшлі да высновы, што такія негатыўныя з'явы, як цяганіна, фармалізм, неаднаразовы перанос тэрмінаў, адсутнасць належнага кантролю за выкананнем, усё яшчэ маюць месца. Асаблівую занепакоенасць выклікае неабгрунтаваная перасылка зваротаў у органы, на якія грамадзяне і скардзяцца, альбо туды, дзе скарга ўжо паспела пабываць. Найбольшая колькасць парушэнняў фіксуецца на мясцовым узроўні, дзе, па сутнасці, павінны вырашацца практычна ўсе бытавыя праблемы. Неабходна ўмацоўваць таксама міжведамаснае ўзаемадзеянне.

Падчас калегіі ў Адміністрацыі быў сфарміраваны пакет прапаноў, накіраваны на ліквідацыю наяўных недахопаў. Напрыклад, прапануецца вывучыць мэтазгоднасць стварэння ў Беларусі адзінай рэспубліканскай аўтаматызаванай сістэмы ўліку і апрацоўкі зваротаў. Прапановы будуць дапрацаваны і затым накіраваны ўсім зацікаўленым у якасці кіраўніцтва да дзеяння. Чакаецца, што гэта дазволіць палепшыць якасць работы са зваротамі грамадзян, у найважнейшым кірунку дзяржаўнай палітыкі, якому Прэзідэнт удзяляе асаблівую ўвагу.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Выбуховае прыстасаванне абясшкоджана ў жылым доме ў Санкт-Пецярбургу

Пра гэта паведаміў кіраўнік адміністрацыі Неўскага раёна горада Канстанцін Сяроў. «Выбуховая прылада знойдзена, яна абясшкоджана», — сказаў ён. Па словах кіраўніка раёна, у кватэры, дзе выяўлена выбуховае прыстасаванне, знаходзіліся не гаспадары кватэры. Як стала вядома, на сёмым паверсе здавалася аднапакаёвая кватэра. На час правядзення праверкі былі эвакуіраваны жыхары кватэр у двух пад'ездах.

### Кароль Тайланда падпісаў новую канстытуцыю краіны



Урачыстая цырымонія падпісання транслiравалася па ўсёй краіне. Гэта важны крок да правядзення ўсеагульных выбараў у краіне. Раней віцэ-прэм'ер Вісану Кхрыа-Нгам паведаміў, што ўсеагульныя парламенцкія выбары пройдуць у Тайландзе ў лютым 2018 года, упершыню з дня ваеннага перавароту 2014-га. Тады была прынята часовая канстытуцыя.

### Еўрапейцы звязваюць поспех правых партый з бяздзейнасцю ўлад

Такія вынікі апытання, што было праведзена адной з найбуйнейшых міжнародных даследчых кампаній TNS Global, якая займаецца апытаннямі грамадскай думкі. У ім узялі ўдзел 3055 рэспандэнтаў з Германіі, Вялікабрытаніі і Францыі. Амаль палова немцаў (43%) лічаць, што асноўнай прычынай росту папулярнасці правых партый у Еўропе з'яўляецца нявыкананы абяцанні ўлад. Такой жа пазіцыі прытрымліваецца 33% брытанцаў і 45% французаў.

### Урад Украіны вырашыў спыніць найбуйнейшыя цеплаэлектрастанцыі



У прыватнасці, гэта Трыпальская, Зміеўская, Прыдняпроўская і Крыварожская ЦЭС, напісаў выканаўчы дырэктар «Укрэнерга» Усевалад Кавальчук у Фэйсбуку. Асноўнай прычынай закрыцця ЦЭС чыноўнікі назвалі завяршэнне ацяпляльнага сезона і неабходнасць эканоміі антрацыта.

■ Бяспека

# ЛІКВІДАВАЦЬ НЯБАЧНАГА ВОРАГА

**Амаль за тры гады пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза Беларусь пазбавілася каля 3,4 мільёна проціпяхотных мін ПФМ-1**



Адзін націск — і міна ліквідавана.




Унікальны мабільны завод іспанскай кампаніі, дзе было знішчана каля 3,4 мільёна проціпяхотных мін.



Так выглядалі знішчаныя боепрыпасы...

Фота Надзеі БУЖАН.

**Апошнія найбольш небяспечныя касетныя боепрыпасы з вадкім выбуховым рэчывам, якія засталіся нам у спадчыну ад Савецкага Саюза, былі знішчаны на вайсковай інжынернай базе, што каля Рэчыцы, у прысутнасці міжнароднай грамадскасці, прадстаўнікоў Узброеных Сіл Беларусі, Міністэрства замежных спраў і журналістаў.**

Без воблакаў пылу і нават бязгучна. І ўсё дзякуючы ўнікальнаму мабільнаму заводу з камерай халоднай дэтанацыі (знішчэння пры дапамозе зарадаў у таўстасценнай бранякамеры). Тэхналогію, распрацаваную спецыяльна для ліквідацыі боепрыпасаў з вадкім выбуховым рэчывам, якая дазваляе бяспечна для навакольнага асяроддзя ўтылізаваць хімічныя кампаненты і адходы, прапанавала іспанская кампанія Expal. Праект падтрымаў Еўрапейскі саюз, вылучыўшы каля чатырох мільёнаў еўра.

— Еўрапейскі саюз вельмі зацікаўлены ў знішчэнні і забароне выкарыстання проціпяхотных мін, таму для нас гэты праект быў вельмі важным, — зазначыла **кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Андрэа ВІКТАРЫН.** — Мы падтрымліваем тое, што Беларусь далучылася да Атаўскай канвенцыі, згодна з якой забараняецца прымяняць, назапашваць, вырабляць і перадаваць проціпяхотныя міны і прадугледжваецца іх знішчэнне. У гэтай сферы мы пакуль не плануем новых праектаў, будзем працягваць супрацоўніцтва па іншых кірунках.

Дарэчы, на аб'екце па знішчэнні проціпяхотных мін быў задзейнічаны беларускі персанал. Работа ў тры змены зрабіла працэс ліквідацыі боепрыпасаў амаль бесперапынным.

Як падкрэсліў **кіраўнік праекта кампаніі Expal Ганзалес КУЭСТА,** міны былі знішчаны без адзінага інцыдэнту. «Выконваліся самыя строгія прынцыпы і правілы тэхнікі бяспекі на вытворчасці, — заўважыў Ганзалес Куэста. — Мы вельмі скрупулёзна прытрымліваліся і рэгламентаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, якія прыняты і выкарыстоўваюцца ў Рэспубліцы Беларусь. Менавіта на экалогію пайшла найбольшая частка інвестыцый, вылучаных на гэты праект».

**Каардынатар праекта, начальнік інжынерных войскаў — начальнік упраўлення інжынерных войскаў Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Андрэй КУРАКОЎ** расказаў, што персанал, задзейнічаны ў знішчэнні проціпяхотных мін, набыў дадатковую прафесію, якая будзе запатрабаваная не толькі ў ваеннай сферы. Акрамя таго, начальнік інжынерных войскаў падкрэсліў, што дадзены тып боепрыпасаў, тэрмін захоўвання якіх складае не больш як 10 гадоў, не адпавядаў патрабаванням бяспекі, таму мог пагражаць жыццю і здароўю беларусаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
*Рэчыцкі раён*

■ Надвор'е

# ЦЯПЛО ВЕРНЕЦЦА

**У суботу — дажджы і нават мокры снег**

**Напрыканцы тыдня надвор'е паказала свой веснавы няўстойлівы характар. У пятніцу атмасферны фронт перамесціцца на ўсход краіны, пасля чаго на тэрыторыю Беларусь будуць паступаць паветраныя масы з Заходняй Еўропы, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

У суботу і нядзелю будзе халаднавата. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, удзень — ад плюс 6 да плюс 12 градусаў. Па паўднёвым захадзе чакаецца крыху цяплей, калі ўначы будзе 4—5 цяпла, а ўдзень — да плюс 15 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, ужо ў панядзелак чакаецца цёплае, пераважна без ападкаў надвор'е. Уначы і раніцай магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 6 градусаў. Удзень — 10—17 цяпла, а па паўднёвым захадзе — нават да плюс 21 градуса. І ў аўторак уначы вялікая частка краіны застанецца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, але ўдзень надвор'ем будзе кіраваць атмасферны фронт, які рухаецца з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Таму ўначы ў крайніх паўночна-заходніх раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, днём па паўднёвым усходзе магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе 2—9 цяпла, удзень — ад плюс 8 да плюс 15 градусаў. Толькі па паўднёвым усходзе максімальная тэмпература складзе да 20 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Аднаго выратавалі, а колькі згарэла?

**У Баранавічах ратавальнікі паехалі па выкліку тушыць сухую траву. Як толькі прыступілі да работы, адзін з пажарных заўважыў нешта жывое каля самага агню. Там варушыўся вожык. Спалоханую жывёлінку аднеслі далей ад вогненнага пекла і выпусцілі. Гэта кранальная інфармацыя за дзень абляцела ўвесь інтэрнэт.**

Супрацоўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ сказаў, што згаданы выпадак далёка не адзінкавы. Нядаўна гэтак жа ратавалі зайца. Але часцей бывае наадварот: байцы пажарна-ратавальнага разліку патушаць ачаг узгарання сухой расліннасці, тады становяцца відаць трупы птушак і дробных жывёлін, якія не паспелі ўцячы ад агню. Пры добрым ветры полымя распаўсюджваецца імгненна і не пакідае насельнікам навакольнага асяроддзя шанцаў на жыццё. А людзі кожную вясну працягваюць паліць траву і плаціць даніну ўласнай неабачлівасці, здараецца, жыццём, нярэдка знішчанымі пабудовамі і мноствам загубленых прадстаўнікоў фаўны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackenich@zviazda.by*

■ Погляд з Беларусі

# УЗІРАЮЧЫСЯ Ў КІТАЙСКІ ВОПЫТ

**Выдавецкі дом «Звязда» прапанаваў чытачу даследаванне беларускага палітолага Віктара Герменчука «Кітай. Крылы дракона».**




Здаецца, што часам даследчыкі кітайскіх здабыткаў у эканоміцы, сацыяльным уладкаванні краіны паўтараюць адно аднаго. І калі прачытаеш з дзясятак кніг, манаграфій пра Паднябесную, яе ўчора і сёння, то ловіш сябе на думцы, што ўсё выкладзенае табе добра знаёмае. Інакшай у выпадку адкрыцця работы кандыдата гістарычных навук Віктара Герменчука, які многія гады аддаў працы ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, — «Кітай. Крылы дракона».

Вучоны пастараўся лаканічна і пераканаўча раскрыць тэму падыходаў заходняй палітычнай навукі да ацэнкі падзей у Кітаі. Сапраўды, пра Кітай шмат пішуць і шмат разважаюць стагоддзямі. А ці заўсёды ацэнкі заходніх — еўрапейскіх ці амерыканскіх — спецыялістаў з'яўляліся ці з'яўляюцца справядлівымі? Аўтар дасведчана зазірае ў сутнасць таго, што адбываецца ў Паднябеснай. Імкнецца, выкладаўшы розныя погляды, даць свой уласны адказ на пытанні, звязаныя з «кітайскім цудам». Адметна, што В. Гермянчук, пакінуўшы ўбаку агульнае захапленне, пранікае ў сутнасць, паказвае пры гэтым добрае веданне кітайскай гісторыі, кітайскіх традыцый. З цікавасцю чытаюцца раздзелы пра барацьбу з карупцыяй, фарміраванне эліты дзяржаўных служачых, суіснаванне бедных і багатых і шмат што яшчэ.

Нагадаем, што кніга вучонага-палітолага В. Герменчука — працяг беларускай кітаязнаўчай бібліятэкі, якая спакваля ствараецца намаганнямі Міністэрства інфармацыі краіны і Выдавецкага дома «Звязда». Крыху раней пабачыў свет зборнік успамінаў беларускіх пасloў у Кітаі. Найлепшыя творы кітайскай мастацкай літаратуры ў перакладзе на беларускую мову былі аб'яднаны ў анталогіі «Стагоддзе на знаёмства». Займела розгалас і кніга «Кітай вачыма беларусаў».

**Мікола БЕРЛЕЖ**

■ Жыллё

# УЗВЕСЦІ ЎЛАСНЫ ДОМ... ПАЭТАПНА

**У краіне назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя павышэння цікавасці насельніцтва да пражывання ў індывідуальных жылых дамах, заявіў учора намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ на адкрыцці міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «Драўлянае і каркаснае домабудаванне. Баня-2017».**

Прадстаўнік Мінбудархітэктуры лічыць гэты напрамак сапраўды перспектыўным, бо такое жыллё валодае пэўнымі перавагамі ў параўнанні з шматпавярховай жылой забудовай. «Галоўная з іх сёння — магчымасць будаваць жыллё з максімальным улікам уласных патрабаванняў да колькасці памяшканняў, плошчы і планіроўкі», — адзначыў намеснік міністра. Паводле яго слоў, не менш важна і тое, што цяпер ёсць магчымасць узводзіць дом чэргамі, павялічваючы яго плошчу паступова пры з'яўленні фінансавых сродкаў і змене патрабаванняў да ўмоў пражывання. «І, безумоўна, спрыяльная экалагічная абстаноўка, бо, як правіла, індывідуальны жылы дом будуецца за горадам», — кажа Дзмітрый Семянкевіч.

Таксама ён адзначыў, што эксперты галіны прагназуюць павелічэнне аб'ёмаў індывідуальнага жыллёва-га будаўніцтва за кошт павышэння індустрыялізацыі самога працэсу — праз перавод індывідуальнай вытворчасці ў механізаваны паточны працэс вырабу ў заводскіх умовах канструкцый, узбуйненых элементаў і блокаў дома з наступнай яго зборкай на будпляцоўцы. Абавязковы этап — распрацоўка розных тыпаў і архітэктурна-планіровачных рашэнняў індывідуальных жылых дамоў заводскага вырабу.

«Перадавыя тэхналогіі індустрыяльнага домабудавання, максімальная заводская гатоўнасць і мінімальна неабходны механізаваны мантаж на будаўнічай пляцоўцы дазваляюць паменшыць выдаткі будучых уласнікаў, расход матэрыялаў, а таксама павысіць якасць будаўніцтва, скараціць яго тэрміны і знізіць кошт дома», — падкрэсліў Дзмітрый Семянкевіч.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# ВЫБУХ БЫЎ ЧУВАЦЬ ЗА 20 КМ

**На Гомельшчыне пры правядзенні земляных работ па добраўпарадкаванні горада Веткі знойдзена 500-кілаграмовая авіябомба часоў Вялікай Айчыннай вайны.**



Побач з месцам жудаснай знаходкі на вуліцы Камсамольскай знаходзяцца прыватныя дамы і рэдакцыя раённай газеты «Голас Веткаўшчыны», якая перадала здымкі. Спецыялісты сапёрна-піратэхнічнай групы ваеннай часці 5525 вызначылі, што нямецкая авіябомба SD-500 знаходзіцца ва ўзведзеным стане. Было прынята тэрміновае рашэнне вывезці яе ў бяспечную зону, бо недалёка яшчэ і газаправад высокага ціску, які забяспечвае газам жылыя дамы, дзіцячыя і медыцынскія ўстановы горада і раёна. Аўтакранам бомбу пагрузілі ў спецыяльны транспарт, прызначаны для перавозкі выбуханебяспечных прадметаў. Знішчэнне адбылося на падрыўной пляцоўцы ў зоне адчужэння Веткаўскага раёна. Выбух быў чуваць на адлегласці ў 20 км ад месца знішчэння боепрыпаса.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*



Фота слова Яўгена Пясецкага



Каб ад хаты сваёй
Цень нягоды адвесці —
Выхадзі грамадой,
Сустракай Дабравесце!

Каб ачулася поле
З новай песняй вясновай —
Адпускайце на волю
Птушак, думкі і словы.

Хай не стане самоты
На блакітнай планеце.
Прагнуць цішы і згоды
Яе Божыя дзеці.

Хай ва ўсіх справы ладзяцца,
Хай вяснуюць пралескі
І для кожнага спраўдзяцца
Добрыя весткі.

# «ДАПАМАЖЫЦЕ ВЯРНУЦЬ ДАЧКУ»

## «Мама яе не абдымае»

Што прымушае бацьку так хвалявацца за дачку? Здавалася б, няма нічога дрэннага ў тым, што дзяўчынка жыве з мамай. Але Ілія Абрамавіч з сумам канстатуе: тая зусім не ўдзяляе дзіцяці часу і не займаецца выхаваннем.

— Я пытаюся ў дачкі: «Мама цябе абдымае, цалуе?» Не. Са шкадаваннем заўважаю, што для яе сям'ёй становіцца школа. Калі Марына ў мяне была, казала, што па сяброўцы сумуе. Але не па маці. Дачка пакутуе з ёй.

Апошні раз мужчына бачыўся з малой у канцы студзеня. Людміла ў якасці выключэння дазволіла забраць дачку на зімовыя канікулы. Іх і яшчэ некалькі тыдняў маленькая Марына правяла з татам у Светлагорску. А потым Людміла заявіла ў міліцыю, што дзяўчынку выкралі, і са скандалам вярнула Марыну дадому.

Адзіная сувязь з дачкой, якая ў мужчыны цяпер засталася, — рэдкія тэлефонныя размовы. Калі ўдасца дазваніцца: тэлефон часта адключаны. Пра сваю маленькую Марыну Ілія Абрамавіч гатовы расказваць гадзінамі. І крыўдуе на прадузятае стаўленне суда да яго. Так, не ідэальны. Кватэры ва ўласнасці не мае (цяпер здымае «двушку» ў Светлагорску), запазычанасць па аліментах — каля 2000 рублёў — не пагасіў. («Выплаціў бы хутчэй, але няма калі працаваць з гэтымі судамі: па пяць пасяджэнняў на месяц».) Але ж ён у адзіночку некалькі гадоў выхоўваў малую, блізкі з ёй, чаму гэта не ўлічваюць?

— Мая дачка страціла тры гады дзяцінства (пакуль ідуць суды. — **Аўт.**). За што мы пакараны — не разумеем. Пры гэтым кожны, хто нас разлучыў, клапоціцца паводле службовага абавязку аб дабрабыце дзяцей. Але я буду змагацца за сваю дачку.

## «Ён ніколі не працаваў»

Каб праясніць сітуацыю, мы вырашылі пагаварыць з Людмілай М. І пачулі зусім іншую версію падзей...

— Уся вёска была ў шоку, калі І. 30 снежня забраў дачку! — расказвае жанчына. — Яна ў школьным лагеры была, не хацела ехаць і эсэмэскі мне слала: «Мама, дапамажы». А я ў той час на рабоце знаходзілася. Пасля па тэлефоне супакойвала Марыну: «Дачушка, не бойся, пабудзеш на канікулах у таты, а потым прыедзеш дадому». Але ён прывёз яе толькі 27 студзеня. Нічога на Новы год не падарыў, трымаў яе там у чатырох сценах. Дзіця амаль месяц вучобы ў школе прапусціла! Цяпер баіцца на вуліцу выходзіць.

Марына з мамай жывуць у адным з аграгарадкоў Лагойскага раёна. У арэнднай кватэры (Людміла цяпер займаецца яе прыватызацыяй) яшчэ ідзе рамонт, але пакой дзяўчынкі цалкам гатовы.

Па словах Людмілы, былы сужыцель распачаў супраць яе сапраўднае цкаванне: піша скаргі на яе брата, старэйшую дачку. Фінансава ніяк не дапамагае. «Уладкуецца на работу, месяц папрацуе і ўсё. Мне апошні раз аліменты прыйшлі — 1 рубель 47 капеек. Нават на каляровую паперу не хапіла».

Людміла сцвярджае, што ніколі не кідала сваю дачку. Так, з'язджала ў Мінск на работу, але гэта былі вымушаныя меры: у аграгарадку заробак маленькі, а Ілія ніколі не працаваў.

— Мы ў галечы жылі. Старэйшая дачка тады на цырульніка ў Мінску вучылася, нават на дарогу ёй грошай не было, — успамінае жанчына. — Але я кожныя выхадныя дадому прыязджала, прадукты прывозіла.

Жанчына ўпэўнена: Марына сказала ў судзе, што хоча жыць з татам толькі таму, што той яе прымусіў. «Абяцаў дачцэ, як прыедзе да яго, і хінкалі зрабіць, і прысмакамі частаваць, а карміў брыдкім супам. Гэта я словы Марыны прыводжу. У І. толькі адзін аргумент — любоў. Але ён не можа забяспечыць ёй нармальныя ўмовы».

— Раней на ўсе канікулы Марыну да бацькі адпускала, — кажа Людміла. — Першы раз ён прывёз яе своечасова, а на другі сказаў, што не аддасць. Я ў міліцыю звярталася, каб дачку дадому дапамаглі вярнуць. Там папярэдзілі: наступны раз ніхто разбірацца не будзе — забяруць дзіця ў прытулак. Я не магла гэтага дапусціць... Я не забараняю Іліі бачыцца з дачкой. Але дзіця само ўжо яго баіцца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
*Лагойскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Паказанні разыходзяцца...

*У школе, дзе вучыцца Марына, расказваюць, што дзяўчынка прыйшла да іх мінулай восенню, у канцы першай чвэрці. Па папярэднім месцы вучобы сям'я стаяла ў сацыяльна небяспечным становішчы праз канфліктныя адносіны бацькоў. Сумнявацца ў кампетэнцыі Людмілы як маці ў школе не бачаць прычын. Шмат працуе, дома ахайна, дзяўчынка акуратна адзетая і добра вучыцца. «І па вёсцы чутак няма, што ў яе ўсё дрэнна». А вось Ілія І. неаднойчы пагражаў педагогам і ўчыняў скандалы. «Тое, што мы назіралі, тату з добрага боку не характарызуе», — заключыла педагог-псіхолаг школы.*

*У Светлагорскім раённым аддзеле адукацыі, спорту і турызму сітуацыю апісваюць інакш:*

*— Ілія звярнуўся да нас пад Новы год. Паведаміў, што з дачкой прыехаў і папрасіў арганізаваць яе навучальны працэс. Па правілах у гэтай сітуацыі патрэбны дазвол мамы. Я тэлефанавала ёй: адчула, што тая катэгарычна супраць, каб дачка тут у школу хадзіла.*

*У дачыненні да Іліі Абрамавіча нічога дрэннага сказаць не магу. Мы выходзілі на месца яго пражывання. Ён стварыў усе неабходныя ўмовы для дзіцяці. Заўсёды былі прадукты, чыстая пасцельная бялізна. Не сказаць, што дзяўчынка была запалоханая. Мы спецыяльна высвятлялі гэта, каб пераканацца, што яе не забралі сілай. Паміж бацькам і дзіцем адносіны даверальныя, добразычлівыя. Мы разумелі, што ён хвалюецца за дачку. Клопат бацькі быў бачны.*

## Меркаванне

**Алег БАКУЛІН, кіраўнік грамадскага аб'яднання «Абарона правоў бацькоў і дзяцей»:**

— У адпаведнасці з артыкулам 74 Кодэкса аб шлюбе і сям'і пры адсутнасці згоды паміж бацькамі спрэчка аб тым, з кім будзе пражываць дзіця, вырашаецца судом, сыходзячы з інтарэсаў дзіцяці і з улікам яго жадання. Суд улічвае, хто з бацькоў праяўляе большы клопат і ўвагу, узрост дзіцяці і прыхільнасць да кожнага з бацькоў, асабістыя якасці таты і мамы, магчымасць стварэння належных матэрыяльна-бытавых умоў і маральна-псіхалагічнай атмасферы, забеспячэнне належнага ўзроўню выхавання. Улічваць пажаданне дзіцяці, якое дасягнула 10 гадоў, абавязкова, за выключэннем выпадкаў, калі гэта супярэчыць яго інтарэсам.

Аналагічнае тлумачэнне дае і Пастанова Пленума Вярхоўнага суда №11 ад 30.09.2004 года. Апроч іншага, там указана, што перавага ў матэрыяльна-бытавым становішчы аднаго з бацькоў сама па сабе не з'яўляецца безумоўнай падставай для перадачы яму дзіцяці на выхаванне.

Але, сыходзячы з маёй практычнай дзейнасці за 26 гадоў грамадскай работы, у гэтай галіне маецца істотны перакос. Пры прыняцці рашэнняў суды толькі фармальна ўлічваюць патрабаванні заканадаўства. Суды ці то не хочуць, ці то не могуць разабрацца ў сямейных сітуацыях і першапачаткова лічаць, што толькі маці можа даць сыну ці дачцэ ўсё, а бацька — не. У выніку спрэчкі аб дзецях цягнуцца часам гадамі, пры гэтым церпяць менавіта тыя, чые правы павінны абараняцца.

■ Не ігнаруйце!

# КУДЫ ПАДЗЕЦЬ НЕГАТЫЎ

**Тэма сёлетняга Сусветнага дня здароўя — «Дапамога людзям, якія пакутуюць ад дэпрэсіі».**

Дэпрэсія выйшла на першае месца ў свеце сярод прычын няяўкі на работу, на другое — сярод захворванняў, якія прыводзяць да страты працаздольнасці. Паводле прагнозаў, да 2020 года дэпрэсія выйдзе на першае месца ў свеце сярод усіх захворванняў!

— Часцей ад дэпрэсіі пакутуюць беспрацоўныя і тыя, хто працуе ў галіне па доглядзе за пажылымі і хворымі, а таксама нянькі, якія даглядаюць малых, далей — работнікі грамадскага харчавання, на трэцім месцы — урачы, а менш за ўсё — вучоныя, архітэктары і інжынеры, — расказвае **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Ганна ГАЛУБІЧ.** — Уплываюць і генетыка, асаблівасці біяхімічных працэсаў, псіхалагічныя асаблівасці, сацыяльнае акружэнне. Паводле адной з тэорый, у чалавека развіваюцца адмоўныя думкі на трох узроўнях: негатыўнае бачанне сябе, навакольнага свету і будучыні. Калі чалавек не можа папярэдзіць нейкія негатыўныя знешнія падзеі, у яго развіваюцца пасіўнасць, пачуццё адчаю і безнадзейнасці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Мядельское райпо, Минская область, г. Мядель, ул. 1 Мая, д. 2 |
| **Предмет аукциона** | |
| **Лот №1 – одноэтажное бревенчатое облицованное кирпичом здание аптеки** (составные части и принадлежности: пристройка, сарай, уборная, колодец), инв. номер 633/С-6758, общ. пл. 125,7 кв. м. Адрес: **Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, д. Будслав**. Сведения о земельном участке: пл. 0,0836 (га), предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг с установленными ограничениями – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос – реки Сервечь, пл. 0,0836 га. **Начальная цена с НДС 20% – 4 000 руб. 00 коп. (снижена на 65%)** | |
| **Лот №2 – магазин** (составные части и принадлежности: две пристройки, склад), инв. номер 633/С-10862, общ. пл. 61,2 кв. м. Адрес: **Минская обл., Мядельский р-н, г. Мядель, ул. Новая, д. 4а**. Сведения о земельном участке: предоставлен Продавцу, пл. 0,0579 (га), на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли с установленными ограничениями – водоохранная зона озера Мястро, пл. 0,0579 га. **Начальная цена с НДС 20% – 3 000 руб. 00 коп. (снижена на 60%)** | |
| **Лот №3 – кафе «Над озером»** (составные части и принадлежности: две беседки, покрытие из бетонной плитки), инв. номер 633/С-11803, общ. пл. 234,3 кв. м. Адрес: **Минская обл., Мядельский р-н, Нарочский с/с, д. Черевки, пер. Центральная, д. 67.** Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания кафе пл. 0,1300 га с установленными ограничениями – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос – озера Нарочь (пл. 0,100 га). **Начальная цена с НДС 20% – 21 000 руб. 00 коп. (снижена на 80%)** | |
| **Лот №4 – здание магазина «Хозтовары»,** инв. номер 633/С-13214, общ. пл. 165,7 кв.м. Адрес: **Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Полевая, 10А.** Сведения о земельном участке: пл. 0,0545 га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 08.01.2113) для обслуживания зданий и сооружений магазина «Хозтовары». **Начальная цена с НДС 20% – 5 500 руб. 00 коп. (снижена на 45%)** | |
| **Лот №5 – артскважина,** инв. номер 633/С-11169. Адрес: **Минская обл., Мядельский р-н, кп Нарочь, ул. Песчаная, д. 21.** Сведения о земельном участке: пл. 0,2783 га, предоставлен для обслуживания зданий и сооружений на праве постоянного пользования с установленными ограничениями – водоохранная зона озера Нарочь. **Начальная цена с НДС 20% – 23 180 руб. 00 коп. (снижена на 5%)** | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете **«Рэспубліка» от 22.02.2017** | |
| **Аукцион состоится 27.04.2017 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 26.04.2017 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | |



**Извещение о проведении 20 апреля 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»**

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220623 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 5 600,00 | 560,00 |
| 2 | Станок универсальный заточной мод. 3Е642Е, год выпуска – 1991 | 4250051 | | 2 640,00 | 264,00 |
| 3 | Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008 | 4101080 | | 7 373,17 | 737,00 |
| 4 | Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008 | 4101081 | | 7 373,17 | 737,00 |

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.
Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.
Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Торги проводятся 20 апреля 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 10.04.2017 по 18.04.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017)217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

# Вясна-красна, што ты нам прынясла? Буйнага жыта — на лета, ядрану грэчку — на восень

Звязда. Наперад у мінулае. Беларусь 3. Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

**У розных рэгіёнах нашай краіны абрад Гукання вясны праводзіўся ў розны час. Недзе пачыналі клікаць птушак і чакаць абуджэння зямлі і надыходу веснавой цеплыні ўжо з самага пачатку сакавіка, а недзе — толькі на другі дзень Вялікадня ці перад святам Юр'я. Натуральна, гэта звязана з рознымі кліматычнымі ўмовамі, а таксама з мясцовымі традыцыямі. Вось і каманда праекта «Наперад у мінулае» разам з нашым карэспандэнтам ужо амаль два месяцы вандруе па краіне, каб як мага больш даведацца пра адметнасці абраду Гукання вясны ў розных рэгіёнах, запісаць як мага больш веснавых песень. Яшчэ ў канцы лютага мы паспелі пабываць у Тонежы, што ў Лельчыцкім раёне, дзе занатавалі адметнасці абраду «Чырачка», крыху пазней завіталі ў Дукору, што на Міншчыне, а таксама адсвяткавалі Стрэчанне ў Капаткевічах Петрыкаўскага раёна. Нашы вандроўкі працягваюцца і ў красавіку. Гледачоў тэлеканала «Беларусь 3» яшчэ чакае знаёмства з адметнасцямі абрадаў, якія ладзяцца на Маладзечаншчыне, Лідчыне і... у сталіцы. Сёння ж мы, як заўсёды, зазірнём у закулісе здымачнага працэсу.**


Грамада з Ходараўцаў кіруецца на гару, каб загукаць вясну.

## ГУКНЕМ «ГУ-У-У-!»

Навукоўцы адзначаюць, што сама назва свята Гукання вясны звязана не столькі з характарам ці сімволікай рытуальных дзеянняў ці ўжывання важных, ключавых атрыбутаў, колькі з асаблівасцямі паэтыкі сакральна-магічных песень-заклічак (загуканняў). Многія песні заканчваліся працяглым «Гу-у-у!», з дапамогай якога выканаўцы пасылалі ў наваколле моцны энергетычны пасыл, які, меркавалася, павінен абудзіць зямлю і наваколле.



Свята ў фальклорным тэатры «Матуліна хата».

Лічыцца таксама, што веснавыя песні адносяцца да тыпу так званых першасных — самых старажытных для беларусаў. Яны наўпрост звязаныя з міфамі і рытуаламі, адлюстроўваюць светаўспрыманне нашых продкаў. Таму і не дзіўна, што такіх песень не так шмат у нашага народа, яны распаўсюджаныя фактычна па ўсёй тэрыторыі краіны. Аднак адметнымі, рэгіянальнымі з'яўляюцца песні другасныя, ужо ўтвораныя, ці, так бы мовіць, надбудаваныя над першаснымі. Няварта здзіўляцца, калі адну і тую ж веснавую песню-заклічку ў крыху адрозных варыянтах вы пачуеце ў некалькіх раёнах краіны.

Дарэчы, мы пераканаліся ў тым, што вельмі падобнымі з'яўляюцца і рытуалы, абрады, якія праводзяцца ў розных раёнах падчас свята. І гэта не дзіўна, бо ўсе беларусы, як у старажытныя часы, так і сёння, увесну жывуць адзіным клопатам пра будучы ўраджай, яго ахову ад непагадзі і шкоднікаў.

Зазвычай свята пачыналася апоўдні. Моладзь збіралася гуртам і ішла за ваколіцу, на ўзвышша, спяваць. Высокае месца выбіралі таму, што яно першае вызвалялася з-пад снегу, а таксама лічылася бліжэйшым да сонца, цеплыні і лепш бачным для птушак, якіх імкнуліся завабіць прыляцець з выраю і прынесці вясну.

Хлопцы раскладвалі вогнішча, на якім палілі старыя рэчы. Традыцыйна вясну гукалі толькі дзяўчаты, хлопцы да свята далучаліся познім вечарам, калі пачыналі разам вадзіць карагоды. Старэйшыя загадзя рабілі арэлі, на якіх моладзь гушкалася парамі, імкнучыся разгайдацца як мага вышэй, каб паказаць сваю сілу, уменне, спрыт. Існавала прыкмета, што чым вышэй разгайдаеш арэлі, тым вышэйшыя вырастуць лён і збажына сёлета. Дзеці таксама павінны былі пагушкацца на арэлях хоць бы адзін раз, каб быць здаровымі і моцнымі ўвесь год.

## КЛІЧАМ ВЯСНУ Ў СТАЛІЦУ

Складана ўявіць, што ў Мінску можна патрапіць у сапраўдную вясковую хату. Дакладней, амаль сапраўдную. Тут, у фальклорным тэатры «Матуліна хата», што працуе пры тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна сталіцы, усё як у вёсцы. Вышываныя фіранкі і абрусы, ікона на покуці, мноства аўтэнтычных музычных інструментаў. Ды і самі ўдзельнікі тэатра — сапраўдныя вяскоўцы ў строях. Дакладней, яны некалі былі вяскоўцамі, але, пераехаўшы з розных прычын у сталіцу, не забываюцца на карані.

Магчыма, справа ў неверагоднай энергічнасці і энтузіязме, з якім працуе кіраўнік «Матулінай хаты», вядомы даследчык фальклору Мікола Котаў. На творчым рахунку Міколы Конанавіча — распрацоўкі сцэнарыяў правядзення абрадаў, песні, танцы. Таму і Гуканне вясны, якое нам паказаў калектыў (а гледачы тэлеканала «Беларусь 3» пабачаць ужо ў нядзелю, 9 сакавіка), уразіла незвычайным аўтарскім падыходам, спалучэннем харэаграфічных, спеўных, музычных элементаў.

У замовах, якія прагучалі падчас абраду, чуецца мудрасць народа, жаданне выконваць запаветы продкаў. А ў песнях, сольных і гуртавых — матывы сапраўднай высакароднай вясковасці, імкненне захаваць яе нават у вялікім горадзе.

*Зарадзі Божа жыта*
*ды на новае лета...*
*Дзе карагод ходзіць,*
*там жыта родзіць,*
*А дзе не бывае, то там палягае...*

## У ГОСЦІ ДА СВЕНТАРЖЭЦКІХ

А вось у вёсках Лебедзева і Маліноўшчына, што на Маладзечаншчыне, Гуканне вясны ладзяць па-свойму. Тут не так даўно аднавілі старажытны абыходны веснавы абрад, амаль як на Вялікдзень. Святкаванне пачынаецца з таго, што ўдзельнікі абраду, сабраўшыся разам каля адной з хат, абыходзяць усю вёску, па чарзе завітваючы ў двары да аднавяскоўцаў. Ім жадаюць здароўя, моцы на ўвесь год і добрага ўраджаю, а гаспадары ў сваю чаргу частуюць музыкаў і спевакоў, дзетак цукеркамі, яблыкамі, пірагамі. Падчас самога свята спяваюць песні, гуляюць у гульні, спальваюць пудзіла зімы і клічуць Вясну. Яе ўвасабляе прыгожая дзяўчына, прыбраная ў адметны строй.

Цікава, што свята ў Маліноўшчыне ладзіцца не на ўзвышшы, а ў іншым знакавым месцы — старажытным парку, які некалі належаў роду Свентаржэцкіх. Гэтыя землі ў пачатку XVIII стагоддзя Клеменс Свентаржэцкі набыў у Радзівілаў. У 1826 годзе тут быў закладзены вялікі сядзібны парк. Дапамагаў Свентаржэцкаму яго ўладкоўваць італьянскі архітэктар, але і самі прадстаўнікі роду заўсёды цікавіліся батанікай і аграноміяй, прывозілі саджанцы розных дрэў з-за мяжы. Некалі парк займаў плошчу ў дзесяць гектараў, але да нашага часу захавалася толькі невялікая яго частка. Ды і яна сёння ўражвае незвычайнасцю планіроўкі, разнастайнасцю дрэваў, што тут растуць.

Пра Свентаржэцкіх у Маліноўшчыне і суседнім Лебедзеве расказваюць ахвотна. Да нашага часу захавалася і ўнікальная па архітэктуры капліца-ўсыпальніца XIX стагоддзя, дзе пахаваныя многія прадстаўнікі гэтага роду. Яе пабудаваў невядомы італьянец, які пасля вайны 1812 года застаўся жыць у вёсцы. Ёсць тут і мемарыяльная скульптура, устаноўленая ў гонар Міхала Свентаржэцкага. Менавіта пры ім гэтыя землі дасягнулі найбольшага росквіту.

**Лічыцца, што веснавыя песні адносяцца да тыпу так званых першасных — самых старажытных для беларусаў. Яны наўпрост звязаныя з міфамі і рытуаламі, адлюстроўваюць светаўспрыманне нашых продкаў.**

Дарэчы, з гэтымі мясцінамі звязана і імя выдатнага паэта, збіральніка народных песень Тамаша Зана. У вёсцы Аборак Тамаш Зан, якому на той час было ўжо 50, пазнаёміўся з маладзенькай Брыгітай Свентаржэцкай, сястрой Міхала. Брыгіта зачытвалася рамантычнай літаратурай і захаплялася творчасцю Адама Міцкевіча.



Неўзабаве яны пакахалі адно аднаго. Маці дзяўчыны была спачатку супраць няроўнага шлюбу, але пасля пагадзілася. Вяселле зладзілі нешматлюднае, акрамя блізкіх сваякоў нявесты, з боку Тамаша Зана былі яго сябры Марыля Верашчака (яе доўгія гады кахаў Адам Міцкевіч) з мужам Ваўжынцам Путкамерам і браты Верашчакі Юзаф і Міхал. У гэтым шлюбе нарадзіліся тры сыны, але шчасце было нядоўгім: праз 11 гадоў пасля вяселля Тамаш Зан памёр...

## ПТУШКІ, ЛЯЦІЦЕ Ў ХОДАРАЎЦЫ

Абрад у вёсцы Ходараўцы на Лідчыне пачынаецца з таго, што маладыя людзі збіраюцца каля адной з хат. У іх руках — саламяныя птушкі, якія сімвалізуюць вясну і прыход цеплыні. Моладзь просіць сталых жыхароў вёскі дазволу загукаць вясну. Пасля іх благаславення ўдзельнікі свята на конях і пешкі кіруюцца на гару. Па дарозе яны вітаюць усіх, каго сустракаюць, развешваюць на дрэвы папяровых птушачак — каб і сапраўдныя хутчэй прыляцелі з выраю.

Ідучы дарогай, спяваюць такую песню:

*Свяці-свяці, сонейка, каб нам было цёпленька,*
*Пад хатаю седзячы, лусту хлеба дзержачы.*
*Ай люлі-люлі, люленькі-люлі.*
*Яечкі качаючы, песенькі спяваючы,*
*Ай люлі-люлі, люленькі-люлі...*

Гуканне вясны, што адбываецца заўсёды на гары, традыцыйна пачынаецца з рытуальнай часткі. Тут гучаць у асноўным песні-замовы, падзякі за цеплыню, пажаданні добрага ўраджаю. Напрыклад, вось такая:

*Дзякуй богу, што вясна прыйшла.*
*Я млада каля жыта пайшла.*
*Расці жыта караністае,*
*Каранiстае, ядранiстае.*
*Каб у трубы пакруцілася,*
*Каб я малада нажалася.*
*І снапочкаў нанасілася.*
*Дзякуй богу, што вясна прыйшла.*

Пазней тут водзяць карагоды, гуляюць у гульні, «гушкаюць» папяровых птушак у посцілцы і, што адметна, ладзяць агульнае частаванне. Усіх удзельнікаў свята частуюць яйкамі, цыбуляй і — а гэта самае смачнае — салам, смажаным на вогнішчы, з хлебам.

Таму зараз, столькі разоў загукаўшы вясну, наша каманда разам з жыхарамі Ходараўцаў можа смела заспяваць:

*Ох ты вясна, ох ты красна,*
*што ты нам прынясла?*
*Я прынясла, прынясла ды карысці,*
*радасці.*
*Буйнага жыта — на лета,*
*ядрану грэчку — на восень.*

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

## Аўторак, 11 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.25** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Жанчына ў бядзе-4».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.45** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**0.20** Дзень спорту.
**0.30 Серыял «Снайперы. Каханне пад прыцэлам».***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.25** Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»***
**11.10, 17.00 Серыял «Анжаліка».***
**12.15, 19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**13.50** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05 Трылер «Тут нехта ёсць...»***
**21.30** Спартлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першы матч. «Барусія» (Дортмунд, Германія) — «Манака» (Францыя).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Бабулькі.
**8.00, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.05, 23.45** «Гэты дзень».
**8.25, 18.40 «Галіна». Драма.***
**9.20, 13.00 «Выклікаем агонь на сябе». Драма.***
**10.35** «Камертон». Галоўны дырыжор Сімфанічнага аркестра Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы і музыкі Аляксандр Сасноўскі.
**11.00, 15.10 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Напісана крывёю». 1-я серыя.***
**11.45** М/ф.0
**12.20** «Мастацтва Беларусі — 1966».
**12.30** «Легенды беларускай эстрады». «Апошні крык песняра». Уладзімір Мулявін.
**14.10** «Выйсце ёсць». Павел Харланчук-Южакоў.
**14.35** «Тэатр у дэталях». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Людзі на балоце».
**15.55, 21.05** «Гонка, якой не было». Дак. фільм.*
**16.30, 21.35 «Месца сустрэчы змяніць нельга». Драма.***
**17.45, 22.50 «Ілюзія палявання». Серыял.***
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.15** «Старыя казкі».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Слуцк» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**9.50** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. ЦСКА (Масква) — «Цмокі-Мінск».
**11.30** Хакей. КХЛ. Фінал. Другі матч. «Металург» (Магнітагорск) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**13.35** Час футбола.
**14.20** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**15.05, 19.05** Хакей. Еўравыклік. Латвія — Беларусь.
**17.00** Тэніс. Турнір WTA. Чарльстан. Фінал.
**21.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**21.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першы матч. «Ювентус» (Італія) — «Барселона» (Іспанія). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**23.40** Спорт-кадр.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Налёт».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.35 Серыял «Салам Масква».*****
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.15 «Белыя ваўкі-2». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Наш чалавек у Гаване».***
**15.45** «Вадзіць па-руску».
**16.00** «Следакі».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.50 Маст. фільм «Маленне».***

### МІР

**6.45** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00** «Зроблена ў СССР».*
**9.25 Серыял «Адлюстраванне».***
**12.30** «Любімыя акцёры», Аляксей Булдакоў.*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**19.20, 4.20 Серыял «Закон і парадак».***
**22.10 Маст. фільм «Альпіністы».*****
**0.00 Серыял «Спрут».***
**2.10 Серыял «Гарачы лёд».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.10** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Асабовая справа».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Таргсін».**
**0.00** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Двайныя стандарты».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».***
**8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».***
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».***
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».***
**17.00, 19.45 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».***
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**21.25 Серыял «Мёртвы на 99%».***
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Шэф».***

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Меладрама «Піяніна».**
**13.00, 19.20 Серыял «Каралеўства».**
**14.25 Серыял «Прыгоды маладога Індзіяны Джонс».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Сябры Дзядулі Марка».
**17.00 Серыял «Каўчэг».**
**18.30 Серыял «Агент Картэр».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Галоўны канструктар».**
**23.10 Серыял «Ведзьмы Усходняга ўзбярэжжа».**



# ПЯКЕЛЬНЫ ВЯПРУК СТВАРЫЎ ТЛУМ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Тлум** — шум, гоман, сумятня.

**Парка́н** — агароджа з бярвёнаў, штыкецін.

**Вяпру́к** — самец свінні.

**Мітка́ль** — простая тонкая бавоўняная тканіна. У слова персідскія карані.

**Чапу́рны** (разм.) — прыбраны, прыхарошаны.

**Пяке́льны** (разм.) — жорсткі, бесчалавечны.

**Хоць шаром пакаці** — нічога няма, зусім пуста. Беларускія адпаведнікі: ні хаты ні лапаты, ні вала ні каня. Рускі: ни кола ни двора.

**Паказаць пяткі** — уцякаць, ратавацца ўцёкамі. Беларусы яшчэ скажуць: навастрыць лыжы, даць драла. Рускія: дать драпака, задать стрекоча.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**6.30, 3.25** М/ф «Смяшарыкі».
**6.50, 3.45** М/ф «Фіксікі».
**7.10, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**7.30, 4.25** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Варонiны».
**9.30** Мюзікл «Прагулка па сонечным святле».
**11.25** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 20.10** Серыял «Кухня-5».
**15.10, 19.00** Серыял «Маладзёжка-4».
**16.20** Серыял «Татавы дочкі».
**18.00, 23.00** «Уральскія пельмені».
**21.20** Камедыя «Няўдачлівыя».
**0.00** Серыял «Закрытая школа».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**1.50** Серыял «Месяц».
**2.40** «Не можа быць!»

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.00** «Біблія». Серыял.***
**12.50, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.15** «Пятае вымярэнне».
**13.45** «Пергалезі. Маці засмучаная стаяла».
**14.40** Сусветныя скарбы.
**15.10** «Старцы і руская літаратура. Мікалай Гогаль». Дак. фільм.
**15.40, 22.00** «У пошуках Жазэфіны». Дак. фільм.
**16.35** «Больш, чым каханне». Бэла Ахмадуліна і Барыс Месэрэр.
**17.15** «Сігурд Шміт. Даверамая асоба гісторыі». Дак. серыял.
**17.45** Творы С. Рахманінава і Г. Свірыдава. Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны камерны хор пад кіраўніцтвам Уладзіміра Мініна.
**18.30** «Аркестр будучыні». Праект Юрыя Башмета.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**21.15** «Гульня ў бісер». «Джэром К. Джэром. «Трое ў адной лодцы...»
**22.55** «Найшчаслівейшы. Халед Аль-Асаад». Дак. фільм.
**23.55** Мастсавет.
**1.35** С. Рахманінаў. Канцэрт №2 для фартэпіяна з аркестрам.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Гурт «Русский размер» і прафесар Лебядзінскі.***
**6.40, 07.55, 11.15, 12.55, 15.40, 17.00, 20.50, 21.40, 23.00, 1.00, 2.05, 5.25** Музычная настальгія.*
**7.00** «Усё будзе так, як мы хочам!» VI Ленінградскі рок-фестываль. 1989 год.***
**8.25** «Ранішняя пошта». «Масква». 1989 год.*
**9.00** Маст. фільм «Шафёр на адзін рэйс».***
**11.25** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Яўген Веснік.*
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.****
**13.05** Дак. фільм «Хто за сцяной?»***
**13.30** Фільм-канцэрт «Дыскжакей».***
**15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР».*
**18.00** «Яловая субмарына». Жанна Агузарава. 2005 год.***
**18.45** Маст. фільм «Госця з будучыні». 1—2-я серыі.*
**23.35** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».*
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1978. 2-я частка. 2008 год.***
**1.10** Фільм-спектакль «Абрабаванне апоўначы». 1978 год.***
**2.35** «Час пік» з Сяргеем Шатуновым.*
**3.00** «Быў час». 2009 год.***
**4.00** Маст. фільм «Дванаццатая ноч».***

### EuroSport 1

**3.15** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**4.00, 8.00, 11.30, 14.35, 23.00, 2.30** Веласпорт. Парыж — Рубэ.
**6.00, 17.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**9.00, 2.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**9.30, 14.00, 1.30** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**10.00** Лёгкая атлетыка. Марафон. Парыж.
**12.30, 19.00, 0.35** Снукер. «Мастэрс». Фінал.
**15.30, 22.00** Веласпорт. Кубак Францыі.
**18.30** «Найлепшае з коннага спорту».
**21.05** Watts. Топ-10.
**21.30** Футбол. «ФІФА».
**0.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.

### Кінакамедыя

**0.40** Прыгоды «Сардэчна запрашаем у джунглі».*
**2.25** Камедыя «Старая добрая оргія».***
**4.05, 14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**4.35, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**4.55** Камедыя «Модная штучка».*
**6.45** Камедыя «Аперацыя «Тушонка».***
**8.45** Камедыя «Змешаныя пачуцці».***
**10.20** Камедыя «Утаймаванне свабоднага».***
**12.15** Камедыя «100 мільёнаў еўра».***
**16.00** Камедыя «Адной левай».*
**17.35** Камедыя «Тата напракат».*
**19.30** Фэнтэзі «Паляванне на монстра».*
**21.30** Камедыя «Бясстрашная гіена-2».*
**23.10** Мюзікл «Самы лепшы дзень».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.20** «Доктар І...»
**8.50, 19.00, 3.00** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.30, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.10** «Сляпая».
**13.10** «Варажбітка».
**14.15** «Паралельны свет».
**15.10** «Вайна нявест».
**15.40** «Здзелка».
**16.10** «Натуральны адбор».
**17.05** «Шчыра».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.50** «Ведзьмакі свету».
**21.45** «Рэвізора».
**22.50** «Гісторыі выратавання».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Шоўгёлз». Драма.****
**2.10** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Робін Гуд: мужчыны ў трыко.*
**8.25** Іствікскія ведзьмы.***
**11.05** Настаўнік на замену.***
**13.10** Кіт.***
**15.15** Галодныя гульні: сойкапераcмешніца. Частка І.*
**20.10** Назад у будучыню І.*
**22.25** Марыя — каралева Шатландыі.***
**0.40** Гарадскія легенды.****
**2.30** Хутчэй за кулю.****
**4.10** Гульня ў імітацыю.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 22.10** Навагодні рэйс.*
**8.30** Апошні забой.***
**10.25** Стары новы дом.*
**12.25** Атэль «У загінулага альпініста».*
**14.20** Іван Царэвіч і Шэры Воўк.*
**16.10** Мой хлопец — анёл.***
**18.15** Слухач.*
**20.20** Джунглі.*
**0.20** Мама дарагая!***
**2.10** Іван Царэвіч і Шэры Воўк-2.*
**3.25** Дэманы.****
**4.35** Пра што яшчэ гавораць мужчыны.***

### National Geographic

**6.00, 13.15, 17.50, 21.00, 0.55, 4.10** Гульні розуму.*
**6.50** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.35, 10.50, 14.45** Мегазаводы.*
**8.25, 15.30** Шаша праз пекла.*
**9.10, 12.20, 18.35, 21.45, 1.40, 5.05** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
**10.00** Паранармальнае.***
**11.35, 16.15, 19.25, 23.20, 2.35** Расследаванні авіякатастроф.*
**20.15** Чалавек супраць YouTube.*
**22.35** Прарыў-2.***

### Discovery

**8.00, 14.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00** Мяцежны гараж.***
**12.00, 19.00** Браты Дызель.***
**17.00** Вялікі махінатар.*
**18.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**20.00** Хуткія і гучныя.***
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## ■ Тэлесеткі

# «НАКАЎТ-РАЎНД» ВЫЙГРАЎ ТРЭНЕР ПА ТЭНІСЕ

## На «Беларусь 5» хутка з'явіцца новы каментатар

Днямі фінішаваў рэаліці-праект «Накаўт-раўнд», які праводзіў спартыўны тэлеканал «Беларусь 5» у пошуку новых вядучых. Па суме галасоў гледачоў і прафесійнага журы пераможцам конкурсу стаў Сяргей Комса — удзельнік зборнай Беларусі па пapplication рыбнай лоўлі і ўладальнік звання КМС па тэнісе, які ўжо некалькі гадоў вучыць настольнаму тэнісу дзяцей у Салігорску.

Нагадаем, рэаліці-шоу стартавала ў канцы мінулага года. З больш як 100 дасланых заявак пасля вочнага кастынгу перад камерай у праект трапілі 16 удзельнікаў, якія на вачах у гледачоў і запрошаных экспертаў адстойвалі сваё права называцца роўнымі сярод лепшых спартыўных каментатараў краіны. Да фіналу ж дайшлі ўсяго чацвёра: Раман Юралевіч, Фёдар Прошкін, Ягор Калеснік і Сяргей Комса, якім давялося адказаць на шэраг няпростых пытанняў, пазнаць беларускіх спартсменаў па паўсядзённых фота і, зразумела, каментаваць яркія спартыўныя падзеі сучаснасці. Сваіх фаварытаў падтрымлівалі галасамі гледачы — на афіцыйнай старонцы тэлеканала «УКантакце», а таксама тэлевізійныя і спартыўныя эксперты. У выніку лідарам абодвух галасаванняў стаў менавіта Сяргей Комса, які атрымаў магчымасць увайсці ў склад каманды прафесіяналаў «Беларусь 5».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
tselyashuk@zviazda.by

■

## Субота, 15 красавіка

### Беларусь 1

**6.50** Існасць.
**7.15 Меладрама «Тэорыя неверагоднасці».***
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Дача.
**9.50 Серыял «Сваты-5».***
**11.05** 50 рэцэптаў першага.
**12.10** Вялікі сэлфі-тур.
**12.45** Здароўе.
**13.30, 15.45 Меладрама «Крыніца шчасця».***
**15.15** Краіна.
**17.40 Меладрама «Тата для Сафі».***
**21.00** Панарама.
**21.45** Святочнае богаслужэнне на Уваскрэсенне Хрыстова па календары каталіцкай канфесіі з архікафедральнага касцёла Панны Марыі.
**23.45** Святочнае богаслужэнне на Уваскрэсенне Хрыстова па календары праваслаўнай канфесіі з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.
**1.45** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05** Дэтэктыў **«Такая работа».*****
**7.45 Серыял «Рыжыя».*****
**8.35, 22.05** Тэлебарометр.
**8.40 Фільм для дзяцей «Разумная дачка селяніна».***
**9.40 Серыял «Шчаслівыя разам 4».*****
**10.45** «Моду народу».
**12.10 Анімацыйны фільм «Незвычайнае падарожжа Серафімы».***
**13.35** «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
**14.30** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.35** Капейка ў капейку.
**16.10 Камедыя «Рымскія прыгоды».*****
**18.05** Рэпарцёр.
**18.50** «Бітва экстрасэнсаў. 15-ы сезон».
**20.55** «Сям'я». Рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.10 Меладрама «Еш, маліся, кахай».*****

### Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 11.50, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.05, 20.25, 0.15** «Гэты дзень».
**8.25** «Беларуская кухня». Велікодны куліч. Клінковы сыр.
**8.50, 17.25** «Час кіно».
**9.00 «Гульня ў чатыры рукі». Камедыя.***
**10.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.00** «Навукаманія».
**11.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» Нясвіж.
**12.10** «Беларуская кухня». Велікодны куліч. Клінковы сыр.
**12.40** «Старыя казкі».
**13.05 «Пітэр Пэн». Казка.**
**15.30** «Камертон». Народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч.
**15.55** Канцэрт фолк-групы «Пава».
**16.50** «Апошні дзень». Васіль Шукшын.*
**17.35 «У цяжкі час». Драма.***
**19.15** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук.
**20.30** «Мастацтва Беларусі — 1967» (чэрвень).
**20.40** «Калыханка».
**21.05 «Сэрцы чатырох». Камедыя.***
**22.30** Канцэрт Андрэя Бачэлі «Адна ноч у Цэнтральным парку».
**0.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці кінарэжысёра Валерыя Басава.

### Беларусь 5

**8.00, 17.20, 22.05** Хакей. Еўравыклік. Беларусь — Германія.
**9.55** Хакей. КХЛ. Фінал. Чацвёрты матч. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Металург» (Магнітагорск).
**11.55** Тэніс. Кубак Федэрацыі. Беларусь — Нідэрланды.
**16.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**19.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першы матч. «Баварыя» (Германія) — «Рэал» (Мадрыд, Іспанія).
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы. Агляд.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».0
**9.20** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.15** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.10** «Вакол смеху».
**15.10** «25 гадоў пасля СССР». Эстонія.
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.25** «Ералаш».
**17.40** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**18.40** «Хвіліна славы». Новы сезон.
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35 Маст. фільм «Жывіце ў радасці».*****



**0.00** «Маё каханне». М/ф.
**0.30 Маст. фільм «Калі можаш, даруй...»*****

### СТБ

**6.00 Маст. фільм «Трэці лішні».***
**7.45** «Тайны Чапман».
**8.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**9.30** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.10** «Самая карысная праграма».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Усім па катку».
**11.50** «Марскі бой: апошні рубеж».
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Адкрытая размова».
**13.55** «Вадзіць па-руску».
**14.10, 1.00 Маст. фільм «Старамодная камедыя».***
**15.55** «Вялікі горад».
**16.45 Маст. фільм «Некалькі дзён з жыцця І.І. Абломава».***
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Сусветны патоп: нараджэнне цывілізацыі славян».
**21.55 Драма «Андрэй Рублёў».***

### МІР

**6.00, 8.20** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**6.15 Маст. фільм «Садко».**
**7.50** «Саюзнікі».*
**9.00** «Вой, мамачкі!»*
**9.30** «Любімыя акцёры», Юрый Багатыроў.*
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».*
**10.45 Маст. фільм «Вакзал для дваіх».***
**13.25** «Цяжар абеду».*
**13.55 Маст. фільм «Папялушка.ру».***
**16.15 Серыял «Заўсёды гавары «заўсёды».*****
**23.00 Серыял «Спрут».*****
**4.05** «З нагоды», Вялікдзень. Надзея на выратаванне.*
**5.00** «Я — валанцёр».*
**5.25** М/ф.0

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Серыял «Сышчык Самавараў».*****
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі».
**12.15** «Пяцёра на аднаго».
**13.05** «Наша справа».
**13.20, 14.15** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**16.00** «Суботні вечар».
**17.50, 21.05 Маст. фільм «Пах лаванды».***
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**23.30** «Вялікдзень Хрыстовы». Прамая трансляцыя Велікоднага богаслужэння з Храма Хрыста Збавіцеля.

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 8.20 Серыял «Агент асобага прызначэння».*****
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Разумны дом».
**10.20** Галоўная дарога.
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.00** Кватэрнае пытанне.
**13.15** «Сыходжанне жыватворнага агню». Прамая трансляцыя з Іерусаліма.
**14.30** НТБ-бачанне. «Афон. Руская спадчына».
**15.25** «Паедзем, паядзім!»
**16.20** «Аднойчы...»
**17.05** «Сакрэт на мільён». Філіп Кіркораў.
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Ты супер!»
**22.15** «Ты не паверыш!»
**23.15 Маст. фільм «Мой грэх».*****
**0.55 Маст. фільм «Дзеля агню».**

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.15, 21.10, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**9.15** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.25 «Сінематограф». Камедыя «Як украсці мільён».**
**11.30 Меладрама «Вакзал для дваіх».**
**13.50** «Сябры Дзядулі Марка». М/ф «Каты не танцуюць».
**15.05 «Глядзім усёй сям'ёй». Серыял «Аднойчы ў казцы».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Айцец Браўн».**
**17.25 Камедыя «Каханне і галубы».**
**19.20 Меладрама «Немаўля ў падарунак».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Меладрама «Дзённік памяці».**
**23.25** Дак. фільм «Уваскрэсенне».

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Мія і я».
**7.30, 2.30** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Егіптус».
**8.30, 3.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.50, 3.20** М/ф «Фіксікі».
**9.10, 3.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**9.30** М/ф «Аліса ведае, што рабіць».
**10.00** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!»
**10.30** Серыял «Татавы дочкі».
**11.30** Серыял «Зблегшыя сваякі».
**13.30, 1.20** «Турбаміксер».
**14.30** Баявік «Рэд».
**16.50** Анімацыйны фільм «Кунг-фу панда-2».
**18.30** Фантастыка «Галодныя гульні: і ўспыхне полымя».
**21.20** «Уральскія пельмені».
**23.00** Жахі «Піранні».
**0.50** «Сэрцы за каханне».
**4.00** «Лаві момант».
**5.00** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Прарокі. Елісей». Дак. фільм.
**10.35** «Прынц і жабрак». Маст. фільм.
**11.55** «Прарокі. Ёна». Дак. фільм.
**12.25** Дзмітрый Корчак і хор Акадэміі харавога мастацтва імя В. С. Попава.
**13.15** «Прарокі. Іезэкііль». Дак. фільм.
**13.45** «Аблудны». Маст. фільм.
**15.00** «Прарокі. Іаан Хрысціцель». Дак. фільм.
**15.30** Да 80-годдзя з дня нараджэння Бэлы Ахмадулінай. Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна». Запіс 1976 года.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Песні кахання». Канцэрт Алега Пагудзіна ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**18.25** «Аляксандр Салжаніцын. «Развагі над Лютаўскай рэвалюцыяй».
**20.10** «Позняе каханне». Маст. фільм.
**22.40** «Белая студыя».
**23.20** «Іван». Маст. фільм.
**1.00** «Рускія святыні». Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны камерны хор.
**1.50** Колер часу. В. Паленаў. «Маскоўскі дворык».
**1.55** «Каралеўства ў пустыні Намібія». Дак. фільм.
**2.50** «Вітус Берынг». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Сняем, сябры!» з Наталляй Казялковай: Тэма: «Юрый Візбар». 2005 год.*
**6.45, 1.20** Маст. фільм «Госця з будучыні».*
**8.50, 9.40, 11.00, 13.00, 14.40, 15.40, 19.05, 20.50, 1.05, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».*
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1970. 2009 год.***
**13.15** Маст. фільм «Калі дрэвы былі вялікімі».***
**16.00** «Колба часу».***
**17.05** Дак. фільм «Старыя майстры».*
**19.15** Маст. фільм «Гарадскі раманс».***
**21.00** «Быў час». 2009 год.***
**22.00** Маст. фільм «Прывітанне, я ваша цётка!»***
**23.40** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён. Салют акцёрам свету!» 1991 год.*
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітко ўскім: «Хачу быць касманаўтам». 2006 год.***
**2.25** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год.*

### EuroSport 1

**2.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**3.00, 8.30** Футбол. «ФІФА».
**3.30** Watts. Топ-10.
**4.00, 10.30** Снукер. Чэмпіянат свету-2016. Фінал.
**5.30, 9.30, 1.00** Веласпорт (трэк). Чэмпіянат свету.
**7.00** Веласпорт. Кубак Францыі.
**9.00** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**12.00, 15.00, 19.30, 21.30, 0.00** Снукер. Чэмпіянат свету.

### Кінакамедыя

**0.50** Меладрама «Майскі дождж».*
**2.30** Камедыя «Адной левай».*
**4.00** «Камедыянты (Шоу)».***
**4.30** Скетчкам «Паміж намі».***
**4.55** Камедыя «100 мільёнаў еўра».***
**6.40** Камедыя «Аперацыя «Тушонка».***
**8.40** Прыгоды «Сардэчна запрашаем у джунглі».*
**10.25** Камедыя «Утаймаванне свавольнага».***
**12.20** Камедыя «Змешаныя пачуцці».***
**14.00** Камедыя «Кур'ер».***
**15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**16.00** Фэнтэзі «Паляванне на монстра».*
**18.05** Камедыя «Джэк і Джыл: каханне на чамаданах».*
**19.35** Мюзікл «Самы лепшы дзень».***
**21.30** Камедыя «Бясстрашная гіена-2».*
**23.10** Камедыя «Дублёр».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10, 5.20** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.00** «Доказ віны».
**11.35, 2.20** «Выйсці замуж любой цаной». Серыял.***
**15.00** «Песня мора». Анімацыйны фільм.
**16.35** «Апакаліпсіс».
**17.35** «Дзікія грошы».
**18.30** «10 самых».
**19.05, 1.35** «Амерыканскі жаніх».
**20.00** «Жанчына з лілеямі». Маст. фільм.***
**21.55** «На грэбні хвалі». Драма.***
**0.10** «Звышнатуральнае». Серыял.

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Назад у будучыню І.*
**8.30** Зязяне.***
**11.25** Штосьці новенькае.***
**13.25** Марыя — каралева Шатландыі.***
**15.50** Пазаземнае рэха.*
**20.10** Жорсткія гульні.***
**22.10** Сем'янін.*
**0.30** Экстрасэнс.***
**2.30** Нешта. 1982.***
**4.20** Нешта. 2011.****

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Суперменеджар, або Матыка лёсу.***
**8.00** Кандагар.***
**10.05** Пацалунак матылька.***
**12.05** Віват, гардэмарыны!*
**14.45** Прыватнае піянерскае.*
**16.50** Мама дарагая!***
**18.40** Джунглі.*
**20.20** Дублёр.***
**22.05** 2 дні.***
**0.00** Каралёў.*
**2.15** Іваноў.***
**5.05** Дэманы.****

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.*
**6.45, 8.20, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.30, 13.05, 18.00, 21.00, 3.05** Пачатак.*
**8.40** Падарожжа да ядра Зямлі.
**10.10** Тытанік: заключнае слова.*
**11.35** Найбуйнейшыя жывёлы ўсіх часоў.*
**12.20, 22.35, 0.50, 2.20** Эвакуацыя Зямлі.*
**13.55** Світанне чалавецтва.*
**14.40** Антарктыка.*
**15.30** Выратаваць планету.*
**17.05, 4.40** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
**19.30** Космас: прастора і час.*

### Discovery

**8.00** Бітвы робатаў.*
**9.00** Залатая ліхаманка.***
**10.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі.***
**11.00, 23.00** Кола: гульня на выжыванне.***
**12.00** Ратавальнікі Эверэста.***
**13.00, 1.00** Аляска: сям'я з лесу.***
**14.00, 22.00** Аляска: апошні рубеж.***
**15.00** Паляванне на труфелі.*
**16.00** Як пабудаваць... што заўгодна.*
**17.00** Тэхнагеніка.*
**18.00, 7.10** Геній аўтадызайну.*
**19.00, 0.00, 5.30** Браты Дызель.***
**20.00** Хуткія і гучныя.***
**21.00** Адам псуе ўсё.***
**2.00** Рачныя монстры.***
**4.40** Мяцежны гараж.***

## Ну і ну!

### Як выйграць мільён долараў

**А трэба ўсяго толькі паказаць сяброўцы, як гэта робіцца. Так, жыхарка амерыканскага горада Фрэдэрыксберг (штат Вірджынія) выйграла мільён долараў, калі паказвала знаёмай, як гуляць у латарэю, паведамляе WTVR.**




Пасля работы амерыканка Мэры Томас і яе сяброўка зайшлі ў супермаркет. Жанчына хацела растлумачыць знаёмай, як карыстацца ўсталяваным у краме аўтаматам латарэі штата. Яна купіла білет, адсканіравала яго пры дапамозе машыны і выявіла, што выйграла мільён долараў! Згодна з правіламі латарэі, выйгрыш можна атрымліваць невялікімі порцыямі на працягу трыццаці гадоў альбо ахвяраваць часткай сумы і забраць рэшту адразу. Томас абрала другі варыянт і атрымала 630 915 долараў гатоўкай.

### У Сіцыліі выклікалі скандал «мафіёзныя туры»

**У італьянскай Сіцыліі выбухнуў скандал вакол мясцовай кампаніі, якая прапануе так званыя мафіёзныя туры па рэгіёне, паведамляе партал The Local.**

Турфірма Easy Trapani, якая базіруецца ў горадзе Трапані, арганізуе паездкі па мясцінах, звязаных з гісторыяй сіцылійскай арганізаванай злачыннасці. Мэр населенага пункта Віта Даміяна раскрытыкаваў дзейнасць кампаніі. «Гэта вар'яцтва, гэта абраза для цэлага горада», — падкрэсліў глава.

Мясцовая жыхарка Марыя Фальконэ, сястра забітага мафіяй у 1992 годзе суддзі, назвала згаданыя туры прыніжэннем для ўсіх ахвяр арганізаванай злачыннасці ў краіне. Паводле яе слоў, гэта закранае і людзей, якія імкнуцца выкараніць крымінал. Менеджар Easy Trapani Джані Грыла, які суправаджае кліентаў фірмы ў паездках, адзначыў, што такія туры на самай справе накіраваныя супраць злачыннасці, бо яны звязтаюць увагу грамадства на гэтую праблему.

Easy Trapani, у прыватнасці, прапануе туры ў Карлеоне — сіцылійскі горад, вядомы дзякуючы раманам і фільмам гангстарскай сагі «Хросны бацька». Кліенты фірмы таксама могуць пабываць у населеным пункце Кастэльветрана, дзе нарадзіўся Матэа Месіна Дэнара па мянушцы Д'яблік. Яго лічаць цяперашнім босам сіцылійскай мафіі, і ён хаваецца ад паліцыі з 1993 года.

### Абвінаваціла ў аварыі... снежнага чалавека

**Жыхарка амерыканскага штата Айдаха паведаміла паліцыі, што трапіла ў аварыю з-за... снежнага чалавека, паведамляе агенцтва Associated Press.**



50-гадовая амерыканка сцвярджае, што ўбачыла незвычайную чалавекападобную істоту, калі ехала цераз лес. Паводле яе слоў, істота (у ЗША яе называюць саскватчам, або бігфутам) бегла па абочыне за аленем. Каб лепей разглядзець бігфута, жанчына паглядзела ў люстэрка задняга віду і не заўважыла аленя, які выскачыў на дарогу перад аўтамабілем. У афіцыйных дакументах здарэнне названа сутыкненнем транспартнага сродку з аленем. Памочнікі шэрыфа не знайшлі пацвярджэнняў таго, што ў інцыдэнце замяшаны бігфут. Існаванне снежнага чалавека не даказана. Па сведчаннях відавочцаў, яны нібыта сустракаюцца ў высакагорных або лясных раёнах.

## ДЗЕ САМЫЯ ПЛАКСІВЫЯ НЕМАЎЛЯТЫ

**Брытанскія псіхолагі ўстанавілі, што ў Вялікабрытаніі, Італіі, Нідэрландах і Канадзе немаўляты плачуць часцей і даўжэй, чым у Даніі, Германіі і Японіі, паведамляе Reuters.**



Навукоўцы супаставілі вынікі назіранняў за 8700 нованароджанымі дзецьмі ў Германіі, Даніі, Японіі, Канадзе, Італіі, Нідэрландах і Вялікабрытаніі. Даследаванне апублікавана ў часопісе Journal of Pediatrics. Даследчыкі выявілі, што ў першыя два тыдні жыцця немаўляты ў сярэднім плачуць каля дзвюх гадзін у суткі. Затым працягласць плачу пачынае расці і на шостым тыдні дасягае 2 гадзін 15 хвілін у суткі. З гэтага ўзросту дзеці плачуць радзей. Да 12 тыдняў плач займае ў сярэднім гадзіну 10 хвілін у суткі. У даследаванні адзначаны істотныя адхіленні ад сярэдняга значэння. Некаторыя немаўляты плачуць не даўжэй за 30 хвілін штодзень, іншым не хапае і пяці гадзін. Розніца шмат у чым залежыць ад краіны, у якой яны нарадзіліся. У прыватнасці, у Канадзе самая вялікая доля немаўлят, якія плачуць больш за тры гадзіны, прынамсі, тры дні на тыдзень: 34,1%. У Даніі такіх дзяцей не больш за 5,5%. Дадзеныя прыводзяцца на сайце EurekAlert!. Публікацыя не тлумачыць, чаму ў адных краінах немаўляты плачуць часцей, чым у іншых.

## ПЕНСІЯНЕРКІ ЗВЯЗАЛІ ВОПРАТКУ ДЛЯ КУРЭЙ

**Удзельніцы клуба аматараў вязання, які дзейнічае пры адным з дамоў састарэлых у прыгарадзе Бостана (Масачусетс), пажадалі дапамагчы курам трапічных парод, якія дрэнна пераносяць халодныя зімы.**



Вязаную вопратку яны аддалі на суседнюю ферму, дзе трымаюць курэй з Малайзіі. Гаспадыня фермы сцвярджае, што птушкі сталі несці больш яек пасля таго, як іх апранулі ў світары. «Птушкам таксама павінна быць цёпла, — кажа адна з удзельніц клуба, 76-гадовая Лібі Каплан. — Я рада, што мы гэта зрабілі». «Не магла і ўявіць, што хтосьці стане вязаць світары для курэй», — прызнаецца 76-гадовая Барбара Відмеер.

## ЗА ПЕСНЮ — У ТУРМУ

**Жыхарку брытанскага горада Уіленхал Соню Брайс прысудзілі да турэмнага зняволення за тое, што яна дапякала суседзы запушчанай па крузе песняй брытанскага спевака Эда Шырана, паведамляе выданне Metro.**

Як сцвярджае пацярпелая, Брайс уключыла песню Shape of You на поўную гучнасць і слухала яе зноў і зноў на працягу паўгадзіны. Паводле слоў суседкі, яе і раней часта даймаў шум з кватэры, але гэты інцыдэнт стаў апошняй кропляй. Раней суд забараніў Брайс перашкаджаць іншым жыхарам, а ў снежні жанчына на шэсць тыдняў трапіла ў турму за парушэнне прадпісання. Вызваліўшы на волю, яна вярнулася дадому і працягнула шумець. Падчас разбору Брайс адмаўляла вылучаныя супраць яе абвінавачванні. Аднак суддзя не паверыў яе апраўданням і прысудзіў жанчыну да зняволення на восем тыдняў. Цікава, а калі б у нас была магчымасць выкарыстоўваць падобную практыку?

**Іван КУПАРВАС** ■

## Нядзеля, 16 красавіка

### Беларусь 1

**6.25 Меладрама «Тэорыя неверагоднасці».***
**8.10** Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Уваскрэсенне Хрыстова (каталіцкі Вялікдзень).
**8.20** Слова мітрапаліта Паўла на Уваскрэсенне Хрыстова (праваслаўны Вялікдзень).
**8.30** Народная раніца.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.45 Серыял «Сваты-5».***
**11.00** «50 рэцэптаў першага».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10, 23.55 Меладрама «За чужыя грахі».***
**15.15** Твой горад.
**15.30** Eurovision. Вынікі тыдня.
**15.50** Вакол планеты.
**16.35** Кулінарная дыпламатыя.
**17.00** Вольга Рыжыкава. Аўтарскі вечар.
**19.00, 22.10 Меладрама «Учора. Сёння. Назаўжды...»***
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.

### Беларусь 2

**7.00 Дэтэктыў «Такая работа».***
**7.40 Серыял «Рыжыя».***
**8.30, 18.05, 22.30** Тэлебарометр.
**8.35** «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
**9.30** «Калі мы дома». Скетчкам.***
**11.00 Меладрама «Еш, маліся, кахай».***
**13.25 Меладрама «Жасмін».***
**15.10** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**16.10** «Універ-шэф».
**16.45** Два рублі.
**17.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**18.35 Драма «Завеўнікі хваляў».***

**20.35, 22.05 Маст. фільм «Геній».***
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.35 Камедыя «Рымскія прыгоды».***

### Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі». Свята-Мікольскі храм (г. Гомель).
**8.00, 11.25, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 11.40, 20.25, 23.40** «Гэты дзень».
**8.25, 11.45** «Размовы пра духоўнае».
**8.35** «Беларуская кухня». Велікодны куліч. Тварожная Пасха.
**9.00 «Пітэр Пэн». Казка.**
**11.55** «Наперад у мінулае».
**12.20** «Нацыянальны хіт-парад».
**13.15** Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў. Опера «Сівая легенда».
**14.45, 21.05** «Час кіно».
**14.55 «У цяжкі час». Драма.***
**16.30** «Артысты — фронту». Дак. фільм.*
**17.15** Трансляцыя Велікоднага Паслання і Благаслаўлення «Граду і Свету» з Ватыкана з удзелам Папы Рымскага Францыска.
**17.55** «То ли еще было...» Творчы вечар народнага артыста СССР Ігара Лучанка і народнага артыста Беларусі Эдуарда Ханка.
**19.25** «Апошні дзень». Васіль Шукшын.*
**20.30** «Мастацтва Беларусі — 1967» (ліпень).
**20.40** «Калыханка».
**21.10 «Гульня ў чатыры рукі». Камедыя.***
**22.45** «Гітара па крузе».

### Беларусь 5

**7.30** Хакей. Еўравыклік. Беларусь — Германія.
**9.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/4 фіналу. Першы матч. «Андэрлехт» (Бельгія) — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія).
**11.15** Тэніс. Кубак Федэрацыі. Беларусь — Нідэрланды.
**14.50, 20.15** Хакей. КХЛ. Фінал. Пяты матч. «Металург» (Магнітагорск) — СКА (Санкт-Пецярбург). (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**17.20, 22.10** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — БК «Ніжні Ноўгарад». (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**19.15** Фактар сілы.
**19.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
